**К. Калеснік**

# ПСІХАЛАГІЧНАЯ ГЛЫБІНЯ АНГЛІЙСКАЙ ПАЭЗІІ XIX СТАГОДДЗЯ

У гісторыі чалавецтва ёсць імёны, якія не перастаюць хваляваць розумы і сэрцы ўсё новых і новых пакаленняў. Джордж Гордан Байран і Томас Мур, Эмілі Бронтэ, Крысціна Расэці – паэты-рамантыкі XIX ст., чыя творчасць

паўплывала на сусветную літаратуру. Псіхалагічная глыбіня іх вобразаў кранае душы чытачоў і па сённяшні дзень.

Для літаратуры ва ўсе перыяды развіцця раскрыццё псіхалогіі чалавека было характэрным, паколькі аб’ект яе пазнання – духоўны свет асобы. Адлюстраванне сродкамі мастацкай літаратуры ўнутранага свету герояў, яго думак, перажыванняў, эмацыянальнага стану, жаданняў называюць тэрмінам *псіхалагізм*. Літаратурны псіхалагізм вызначаецца як мастацкае засваенне чалавечай свядомасці, як індывідуалізаванае прайграванне перажыванняў у іх узаемасувязі, дынаміцы і непаўторнасці.

Творчасць Джорджа Гордана Байрана лічылася экстраардынарнай нават для свайго часу. Некаторыя крытыкі называлі яго “змрочным эгаістам”, бо ў сваіх паэмах ён асаблівую значнасць надаваў сабе, аднак разам з гэтым паэт дакладна бачыў, што рамантычныя ідэалы не адпавядаюць рэальнасці, таму ў яго творах часта можна пачуць панурыя ноткі. Яго паэтычнае слова гучыць вельмі ўзважана і прадумана, бо задача паэта – узнавіць чалавечае пачуццё, растлумачыць яго, адкрыць яго ва ўсёй разнастайнасці і глыбіні. Любоўная лірыка Дж. Г. Байрана грунтуецца не столькі на прамаце слоў для перадачы думкі, колькі на прамаце эмоцый.

Блізкі сябар Дж. Г. Байрана Томас Мур – паэт, песеннік і аўтар балад, адзін з асноўных прадстаўнікоў ірландскага рамантызму. Перавагу ў сваёй творчасці Т. Мур па вялікім рахунку аддаваў грамадзянскай паэзіі. У сваёй лірыцы паэт таксама апісвае самыя розныя адценні любоўнага пачуцця. Творы Т. Мура ўвасабляюць упэўненасць рамантыкаў у шчаслівай будучыні. Крытыкі падкрэсліваць здольнасць Т. Мура знаходзіць нават у самай звычайнай, непрыкметнай асобе, прадмеце ці з’яве штосьці прывабнае і выдатнае. У адрозненні ад творчасці Дж. Г. Байрана, якая характарызуецца спакойнымі фарбамі і цёмнымі адценнямі, творы Т. Мура напоўнены яркім светам, жыццём, радасцю, пяшчотнасцю, шчырасцю, якія ў гэткім аб’ёме сустракаюцца ў нешматлікіх паэтаў.

Крысціна Дж. Расэці – англійская паэтэса і пісьменніца, аўтар вершаў і апавяданняў, часткова праілюстраваных яе братам Дантэ Габрыэлем. Сярод тэм у лірыцы К. Расэці вылучаюцца марнасць, нікчэмнасць пачуццёвых уцех, сіла кахання і яго недасканаласць, жыццё як узыходжанне да духоўных вышынь і смерць як заслужаны спачын, таксама ператварэнне і ўз’яднанне з Вечным. Творчасць паэтэсы багатая на вобразы, поўная рытмічнага наватарства ў спалучэнні са строгай архітэктонікай верша.

Эмілі Джэйн Бронтэ – аўтар, які лічыцца геніяльным празаікам, неардынарная паэтэса, псіхолаг і філосаф. Вершы Бронтэ адрознівае тонкі псіхалагізм, вострая пастаноўка нетрывіяльных праблем светаўспрымання чалавека.

Такім чынам, творчасць англійскіх паэтаў XIX ст. увайшла ў гісторыю сусветнай літаратуры як выдатная мастацкая з’ява, звязаная з эпохай

рамантызму, у межах якога аўтары звярталіся да такога прыёму, як псіхалагізм, а іх паэтычныя традыцыі былі працягнуты і развіты лірыкамі наступных пакаленняў.